*Мова СМІ*

Уладзімір КУЛІКОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук,
Святлана ХВАЛЕНЯ,
аспірант кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта

# ЖАНРАВЫ, ТЭМАТЫЧНЫ І МОЎНА-СТЫЛІСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫХ ЧАСОПІСАЎ

УДК 070.41:811.161.3

Пададзены вынікі комплекснага аналізу тэкставага беларускамоўнага корпуса навукова-папулярных часопісаў (2022–2025) з мэтай выяўлення іх жанравай, тэматычнай і моўна-стылістычнай спецыфікі. Метады даследавання ўключаюць кантэнт- і лінгвастылістычны аналіз, лінгвастылістычны і камп'ютарызаваны частотны дыскурс-аналіз. Вызначаны асноўныя тэндэнцыі ў выкарыстанні жанраў, моўных рэсурсаў і ў асвятленні актуальных напрамкаў жыцця сучаснага грамадства.

Ключавыя словы: *навукова-папулярны часопіс, беларускамоўны дыскурс, мова СМІ, частотны дыскурс-аналіз, лексіка-статыстычны аналіз, жанравая дыферэнцыяцыя, марфалагічная структура, сінтаксіс.*

The results of comprehensive text analysis of the Belarusian-language corpus of popular science magazines (2022–2025) in order to identify their genre, thematic and linguistic-stylistic specificity are presented. The research methods include content analysis, linguistic-stylistic analysis, computerized frequency discourse analysis. The main trends in the use of genres, linguistic resources and coverage of relevant ways of life in modern society are identified.

Сучаснае інфармацыйнае грамадства атаясамліваецца з ведамі [3]. Таму прыярытэтамі любой сённяшняй дзяржавы, у тым ліку і Беларусі, з'яўляюцца: 1) папулярызацыя навукі; 2) падтрымка прэстыжу навукова-тэхнічных прафесій. Вырашэнне гэтых задач звязана з дзейнасцю навукова-папулярных часопісаў, вывучэнне якіх у Беларусі знаходзіцца ў зародкавым стане [7]. А між тым актуальнасць іх даследавання для журналістыкі і выдавецкай справы відавочная, бо менавіта ім належыць выключная роля ў павышэнні навуковай адукаванасці насельніцтва, у развіцці крытычнага мыслення моладзі. Акрамя таго, навукова-папулярныя часопісы, дзе, у адрозненне ад навуковых перыядычных выданняў, пераважае журналісцкая творчасць, а не вынікі даследаванняў, рэалізуюцца асветніцкія функцыі журналістыкі, а не функцыі стымуляваць развіццё навуковай думкі [6], могуць служыць каштоўным рэсурсам для настаўнікаў як прыклады для абмеркавання, як дадатковыя матэрыялы для даследавання, як люстэрка дынамічных працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве [2]. Вынікі вывучэння такой перыёдыкі дазволяць распрацаваць актуальную тыпалагічную мадэль навукова-папулярнага выдання, будуць спрыяць яе паспяховай трансфармацыі.

Задача артыкула – вызначыць асноўныя тэндэнцыі выкарыстання жанравага, тэматычнага, моўна-стылістычнага патэнцыялу ў беларускамоўных публікацыях сучасных навукова-папулярных часопісаў Беларусі.

Матэрыялам для даследавання паслужылі 65 тэкстаў (каля 52 000 слоў) з часопісаў "Беларуская думка", "Бібліятэчны свет", "История и современность", "Планета – семья", "Родная прырода" за апошнія тры гады (2022–2025).

Праца грунтуецца на комплекснай метадалогіі, якая ўключае шматузроўневы аналіз тэкставага матэрыялу. Выкарыстоўваліся метад кантэнт-аналізу (для класіфікацыі артыкулаў па жанрах і тэматычных блоках), лексіка-статыстычны метад (для вызначэння лексічнага ядра тэкстаў і колькаснага аналізу часцін мовы), метад лінгвастылістычнага аналізу (для вывучэння асаблівасцей мовы), метад частотнага дыскурс-аналізу, які дазволіў ацаніць асноўныя тэндэнцыі і выявіць лексічныя дамінанты тэкстаў, а таксама суадносіны розных граматычных катэгорый, што, у сваю чаргу, уплывае на стыль і танальнасць падачы.

Апошні з метадаў быў камп'ютарызаваны для атрымання найбольш аб'ектыўных і дакладных даных. Ён уключае шэраг узаемазвязаных этапаў: 1) збор і алічбоўка матэрыялаў з масіву друкаваных навукова-папулярных публікацый; 2) "ачыстка" тэкстаў ад знакаў прыпынку, прывядзенне да адзінага рэгістра; 3) такенізацыя, калі тэкст разбіваецца на лексічныя адзінкі (токены, або лемы) у кожнай форме слоў; 4) фільтрацыя агульнаўжывальных службовых часцін мовы; 5) частотны падлік, г. зн. колькасная ацэнка частаты выкарыстання кожнай лемы.

**Жанравая сістэма.** Жанрам прынята называць форму падачы матэрыялу ў журналісцкім тэксце, якая характарызуецца агульнасцю структурна-кампазіцыйных і стылістычных элементаў. Вылучаюць тры віды жанраў: інфармацыйныя, аналітычныя, мастацка-публіцыстычныя [1]. На выбар іх у прааналізаваных выданнях уплывае той факт, што ніводзін нацыянальны наву-

кова-папулярны часопіс не пазіцыянуе сябе як выключна навукова-папулярнае выданне [5]. Кожны з іх мае дадатковыя тыпалагічныя характарыстыкі. Напрыклад, "Беларуская думка" – навукова-папулярны і грамадска-палітычны; "Планета – семья" – навукова-папулярны і літаратурна-мастацкі. Іерархія выкарыстаных жанраў выглядае наступным чынам.

Найбольш частыя жанры – ***аналітычныя***. У іх, як правіла, акцэнтавана ўвага на фактах і карыснасці інфармацыі. Да іх адносяцца:

– артыкулы, у тым ліку і навуковыя: *Елісееў А. Б. Подпісы паўнамоцных прадстаўнікоў БССР пад Дагаворам аб утварэнні СССР* (Беларуская думка, 2023, № 2, с. 81–88);

– рэцэнзіі, якія змяшчаюцца ў адмысловых рубрыках пад назвамі "Кніжная паліца" ў часопісе "Беларуская думка", «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне" прапануе» – у часопісе "История и современность"; "Новыя кнігі" – у часопісе "Планета – семья";

– рэкамендацыі – разгорнутыя прадпісанні, парадак дзеяння ў якой-небудзь сітуацыі. Прыкладам можа служыць матэрыял "Шпацыр у халады" З. Салаўёвай (Родная прырода, 2023, № 10, с. 46);

– гутаркі і аналітычныя інтэрв'ю, дзе змешчаны адказы не толькі на канкрэтныя, але і на агульныя пытанні. Напрыклад, у матэрыяле "Трэба трымацца свайго" Віталь Карпанаў не толькі дзеліцца сакрэтамі поспеху гурта "Дразды", але і разважае пра беларускую мову, вясковае жыццё (Беларуская думка, 2023, № 2, с. 25–27).

***Мастацка-публіцыстычныя*** жанры найчасцей выкарыстоўваюцца ў часопісе "Планета – семья". Сярод іх: апавяданні, казкі (беларускія народныя, арабскія), прытчы, вершы, паданні ("Адкуль пайшло прозвішча Рубцоў"), эсэ, байкі. Тут існуе нават рубрыка "Жыццёвыя гісторыі", дзе прапануюцца апісанні эпізодаў з жыцця людзей. Асобныя нарысы сустракаюцца і ў іншых выданнях: *Ганчарук І. Півоні з кветніка ля бацькоўскай хаты* (Беларуская думка, 2025, № 6, с. 3–4).

***Інфармацыйныя*** жанры прадстаўлены пераважна справаздачамі (аповеды пра мерапрыемствы; яны найчасцей сустракаюцца ў часопісе "Бібліятэчны свет": *Лаптушка М. Інфармацыйны сэрвіс: ад бібліятэкі да бібліобуса*; 2025, № 2, с. 16–18); нататкамі (рубрыка "Навіны навукі" ў часопісе "Беларуская думка").

Шырокі **тэматычны спектр** журналісцкіх тэкстаў ахоплівае значныя сферы грамадскага жыцця. Выяўленыя ключавыя напрамкі:

– экалогія і прырода: пытанні распаўсюджвання інвазіўных відаў, барацьбы з небяспечнымі рэчывамі, а таксама захавання біяразнастайнасці;

– гісторыя і патрыятызм: асвятленне ваенных падзей (савецка-польская вайна, гераічныя падзеі і подзвігі партызан у Вялікай Айчыннай вайне);

– культурныя падзеі і этнаграфія: матэрыялы пра бібліятэчныя мерапрыемствы, фестывалі, беларускія легенды, традыцыі і касцюмы.

**Па qr-кодзе даступны спіс літаратуры і іншыя матэрыялы, пазначаныя ⤓.**

Асаблівую значнасць мае ўключэнне навуковых тэм і дасягненняў (напрыклад, *глебазнаўства* і *глебаахова*), што дэманструе здольнасць беларускай мовы функцыянаваць як паўнавартасны сродак камунікацыі для апісання складаных спецыялізаваных канцэпцый па-за межамі гуманітарнай сферы.

Тэматыка адлюстроўваецца і праз пэўныя выяўленыя лексічныя дамінанты. У воблаку слоў ⤓ прадэманстраваны 25 найбольш распаўсюджаных. Іх памер – у адпаведнасці з велічынёй, што дазваляе зрабіць высновы пра кантэкстуальную накіраванасць артыкулаў.

Найбольш частыя словы – *навука* (141), *Радзіма / радзіма* (108) і *Беларусь* (73). Гэта сведчыць пра моцны акцэнт публікацый на навуковых дасягненнях, тэмах патрыятызму і нацыянальнай ідэнтычнасці, што спалучае адукацыйную і выхаваўчую функцыі выданняў. Высокія пазіцыі лексем *людзі* (99) і *дзеці* (98) падкрэсліваюць чалавекацэнтрычнасць матэрыялаў і іх зварот да грамадскіх пытанняў. З сацыяльнай накіраванасцю часопісаў звязана і частае паўтарэнне лем *дзейнасць* (80), *чытаць* (72), *свет* (70). Прысутнасць лексем, звязаных з гісторыяй і тэматыкай вайны (*вайна*, *партызаны*, *герой*), тэхнічнымі і экалагічнымі пытаннямі (*ПХБ*, *паветра*), падкрэслівае напрамкі дзяржаўнай палітыкі нашай краіны.

Суадносіны часцін мовы значна залежаць ад жанравай атрыбуцыі тэкстаў. У мастацка-публіцыстычных матэрыялах дамінуюць назоўнікі і прыметнікі (*вогненна-чырвоны акраец сонца*, *жыватворныя хвіліны*), якія выконваюць функцыю эмацыйнай афарбоўкі і стварэння маляўнічых апісанняў. У аналітычных жанрах пераважае назоўнік як часціна мовы "з большай семантычнай ёмістасцю" [4, с. 172]), але выкарыстоўваецца для абазначэння фактаў і паняццяў (*рэпатрыяцыйны этап*, *эпідэмія*). Прыметнікі (*польска-савецкая вайна*, *санітарная*

*наступствы*) маюць тлумачальны характар. Інфармацыйныя жанры характарызуюцца большай колькасцю дзеясловаў (*адбылася сустрэча, пачаліся палявыя работы*). Гэтым падкрэсліваецца дынаміка і аператыўнасць інфармацыі.

Стылістычны аналіз моўнага асяроддзя сучаснай беларускай навукова-папулярнай прэсы паказвае на багацце вобразных сродкаў і сінтаксічных канструкцый, якія выкарыстоўваюцца ў тэкстах. Аўтары актыўна ўжываюць тропы і фігуры, сярод іх вылучаюцца: эпітэты (*вогненна-чырвоны акраец сонца; жылістая котка; шчырая, сяброўская атмасфера; лагодны цёплы вецер*); метафары (*глыбінныя пласты чалавечай псіхікі; кніжная аранжарэя; злом эпох*) – яны дазваляюць перадаваць абстрактныя паняцці праз больш канкрэтныя вобразы, тым самым у чытача паляпшаецца ўспрыманне нават складаных ідэй; параўнанні (*вагоны… скляліся як папяровыя; павучок гойдаўся… як на арэлях*) – дазваляюць зрабіць вобразы яшчэ больш наглядныміі выразнымі; перыфразы (*лясную грацыю, лясную прыгажуню, вечнай лясной вандроўніцай, ладная жылістая котка, пані котка* ‘рысь’); антрапамарфізм (*паравоз, быццам жывы, устаў на дыбы*); інтэртэкстуальнасць, у прыватнасці адсылкі да гістарычных падзей (*Вялікая Айчынная вайна, Герой Савецкага Саюза*) і дзіцячых твораў (*“Казка пра рыбака і залатую рыбку”*); паралелізм (*не толькі для асабістага ўжытку, але і для прамысловага*); рытарычныя пытанні (*Што такое ПХБ?; Ці не зусім котка?; Хіба ж гэта апантанаму грыбніку перашкода?*) і інш.

Сінтаксічная будова сказаў у корпусе даследавання таксама вар’іруецца. У інфармацыйных жанрах часта выкарыстоўваюцца простыя і кароткія сказы, што павялічвае дынаміку і робіць тэкст больш лёгкім, хуткім для чытання. У аналітычных жанрах шырока пададзены складаныя сінтаксічныя канструкцыі: *А вось касцёлу Святога Юрыя, пабудаванаму ў 1825 годзе тагачаснай уладальніцай Святыч дачкой Міхаіла Абуховіча Соф’яй Чапскай, хоць і давялося перажыць пераробку ў праваслаўную царкву (у 1992 годзе адрамантаваны і перададзены веруючым), а таксама моцны пажар у Першую сусветную вайну, пашчасціла захавацца і стаць помнікам архітэктуры XIX стагоддзя* (Планета – семья, 2023, № 4, с. 47)

Звернем увагу на дзве істотныя, на наш погляд, тэндэнцыі ў выкарыстанні моўных сродкаў, звязаныя з паняццямі культуры мовы і культуры выдання.

• Актыўнае выкарыстанне дзеепрыметнікаў на *-учы / -ючы*, якія, як адзначаецца ў навуковай літаратуры, аманімічныя з дзеепрыслоўямі, а таму павінны выкарыстоўвацца абмежавана: *работа з падрастаючым пакаленнем, акцыя “Чытаючы аўтобус”, эшалоны з жадаючых трапіць за мяжу, “кампраметуючых матэрыялаў”, галоўныя дзеючыя асобы, асноўным рашаючым аргументам, перададзены веруючым, чытаюць інтрыгуючы дэтэктыў; Прапусцілі лёгка пагрукваючы па стыках рэек таварны паражняк…; Пры адсутнасці толу або дэтануючых капсул на рэйкі падкладваліся спецыяльныя стальныя кліны* (Родная прырода, 2025, № 5, с. 5). *Каб ачысціць радзіму ад гітлераўцаў, Фёдар Малынаў быў вымушаны ўзрываць родную зямлю, якую марыў пакрыць квітнеючымі садамі* (Родная прырода, 2025, № 5, с. 6).

• Наяўнасць графіка-арфаграфічных, лексічных, граматычных памылак, што адмоўна ўплываюць на фарміраванне чытацкай кампетэнцыі.

Прывядзём прыклады, якія могуць служыць матэрыялам для выпрацоўкі навыкаў рэдагавання тэкстаў па-беларуску.

1. Беларускі *палітэхнічны* інстытут. 2. Усё было ахоплена агнём, зямлю *скалыналі* моцныя выбухі. 3. Сталі ўладаннем графа Ясіньчыка з *шырока вядомага* на Беларусі роду Абуховічаў. 4. Значную частку навукова-даследчыцкай дзейнасці праводзіў на тарфяной *вопытнай* станцыі ў Дукорах. 5. Знаходзіцца ён *у некалькіх кіламетрах* ад Слаўгарада. 6. Побач з Блакітнай крыніцай пабудавана невялікая Свята-Макавееўская *часоўня*. 7. Пасля некалькіх аварый на “стрэлках” фашысцкія цягнікі сталі хадзіць павольна, амаль *навобмацак*. 8. У ноч аперацыі дзьмуў пранізлівы вецер, які з сілай шпурляў у твар мокрае снежнае *крошыва*. 9. Невялічкая вёсачка Святычы размясцілася на левым беразе рэчкі з *палохаючай* назваю Ведзьма – левым прытоку Шчары, *у 16 км* ад Ляхавіч (Брэсцкая вобл.). 10. Як правільна паклапаціцца пра свайго *чацвёраногага* сябра.

Такім чынам, у адносінах да беларускамоўных матэрыялаў навукова-папулярных часопісаў Беларусі можна сцвярджаць наступнае. Публікацыі на беларускай мове паводле тэматыкі і праблематыкі, зместу маюць гуманістычную місію, якая рэалізуецца найперш з дапамогай аналітычных жанраў. Тэматыка артыкулаў не абмяжоўваецца толькі гуманітарнай сферай. Лексічнымі дамінантамі тэкстаў выступаюць назоўнікі *навука, Радзіма / радзіма, Беларусь*. Аўтары шырока выкарыстоўваюць моўныя рэсурсы, пры дапамозе якіх актуалізуюцца важныя праблемы сучаснасці. На жаль, асобныя публікацыі па-беларуску маюць шэраг памылак, прычына якіх, на наш погляд, – празмерны давер рэдактараў да электронных сродкаў перакладу з рускай мовы на беларускую.